брить домового. Причем жених бросал две копейки, а невеста – на копейку больше, так как она хозяйка, выполняла все домашние работы и чаще должна была находиться в доме.

Деньги используются и в испытаниях невесты на второй день свадьбы. Обыденное занятие хозяйки – подмести избу – в контексте свадебного обряда приобретает сакральный смысл.

*На други день далжна нявеста месть палы. Рассыпають* ***мелач****, рвуть бумагу, правяряють, ти не сляпая нявеста* (д. Лобковичи, Крич. Мгл.). При этом так называемый «мусор», в том числе и деньги, и веник осмысливаются как символы хорошей доли, благополучия, достатка.

Широкое распространение в свадебном обряде имеет фразеологизм *сыпать медь* в значении «откупаться деньгами».

*Мяне, кагда замуш аддавали, так схавали у прымыльнику, жаниху прышлося багата меди сыпать* (д. Ленино, Гор. Мгл); *Кали жаних выкупая нявесту, яму трэба многа сыпать меди, а то ни аддадуть* (д. Полошково, Клим. Мгл.).

Медь, наряду с золотом и серебром, выступает как символ богатства и, благодаря своему цвету и блеску, соотносится со светом, небесными светилами, высшим божественным началом [5, с. 245].

Таким образом, деньги в составе свадебного обряда используются постоянно на всех этапах. Они выступают и как материальная ценность, и как символ богатства и процветания, и в качестве платы или дара за совершение того или иного ритуального действия. Чаще всего речь идет о монетах (из меди, серебра, золота). Символика металлов предопределяет семантику ритуальных действий.

ЛИТЕРАТУРА


1. Славянские древности: Этнолингвистический словарь : в 5 т. / под ред. Н. И. Толстого. – М. : Международные отношения, 1999. – Т. 2 : Д-К. – 687 с.
2. Славянские древности: Этнолингвистический словарь : в 5 т. / под ред. Н. И. Толстого. – М. : Международные отношения, 1995. – Т. 1 : А-Г. – 584 с.
3. *Казакова, І. В.* Этнічныя традыцыі ў духоўнай культуры беларусаў / І. В. Казакова. – Мінск : Універсітэцкае, 1995. – 151 с.
4. Вяселле. Абрад / уклад., уступ. арт. і камент. К. А. Цвіркі ; рэд. тома В. К. Бандарчык, А. С. Фядосік. – 2-е выд. – Мінск : Бел. навука, 2004. – 683 с.
5. Славянские древности: Этнолингвистический словарь : в 5 т. / под ред. Н. И. Толстого. – М. : Международные отношения, 2007. – Т. 3 : К-П. – 695 с.


УДК 94(476):34(09)“1864”

## МЕСЦА СУДОВАЙ РЭФОРМЫ 1864 г. У МАДЭРНІЗАЦЫЙНЫХ ПРАЦЭСАХ НА ТЭРЫТОРЫІ БЕЛАРУСІ Ў АПОШНЯЙ ТРЭЦІ XIX – ПАЧАТКУ XX ст.

**Гушчынскі Ігар Генадзьевіч**
кандыдат гістарычных навук, дацэнт, дацэнт кафедры гісторыі Беларусі і славянскіх народаў Беларускага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта імя Максіма Танка”
(г. Мінск, Беларусь)

Перыяд апошняй трэці XIX – пачатку XX ст. ў гісторыі Расійскай імперыі адметны інтэнсіўнымі працэсамі трансфармацыі грамадства ў накірунку ад традыцыйнага да індустрыяльнага. Прычым гэта выразілася не толькі ў пераходзе эканомікі на капіталістычныя рэйкі развіцця і фарміраванні адпаведнай сацыяльнай структуры, але і значных зменах у грамадска-палітычным жыцці, культуры, менталітэце людзей. Ключавое месца ў дадзеных працэсах займаюць буржуазныя рэформы 60–70-х гг. XIX ст., у тым ліку судовая рэформа 1864 г. Для вывучэння дадзенай праблематыкі эфектыўным бачыцца выкарыстанне так званай мадэрнізацыйнай канцэпцыі [1, с. 38–41].

Паняцце мадэрнізацыі мае некалькі значэнняў. У кантэксце разглядаемых праблем пад ёй мы будзем разумець комплексны працэс змены традыцыйнага (аграрнага) грамадства індустрыяльным (сучасным), які закранае розныя сферы жыцця – эканамічную, сацыяльную, палітыка-прававую, культурную. З паняццем мадэрнізацыі шчыльна звязаны працэсы індустрыялізацыі, урбанізацыі, станаўлення нацыі, змен у менталітэце насельніцтва, фарміравання іерархічнай сацыяльнай структуры грамадства [2, с. 213].

Спецыфічнай рысай расійскай мадэрнізацыі другой паловы XIX – пачатку XX ст. з’яўляўся яе імперскі характар, бо самадзяржаўе ажыццяўляла яе перш за ўсё ў мэтах стабілізацыі і кансервацыі базавых характарыстык імперыі і не ставіла сваёй мэтай эвалюцыю дзяржавы ў кірунку інтэграцыі ў цывілізацыю мадэрнасці [3, с. 52–53]. Рэфармісцкія памкненні царскага ўрада заканчваліся там, дзе пераўтварэнні ставілі пад пытанне яго татальны кантроль над грамадствам (перш за ўсе палітычнай сферай). Контррэформы былі практычна непазбежнымі, бо прыводзілі розныя сферы грамадскага жыцця ў адпаведнасць з самадзяржаўна-імперскай мадэллю палітычнага кіравання, рэсурс якой у апошняй трэці XIX ст. быў дастаткова моцным. Гэта выразна бачна на прыкладзе судовай рэформы 1864 г., асноўныя прынцыпы якой (незалежнасць суда ад адміністрацыйнай улады, галоснасць і спаборнасць судаводства, дапушчэнне грамадскасці да ўдзелу ў правасуддзі праз інстытут суда прысяжных) па сваёй сутнасці супярэчылі самадзяржаўнаму ладу. Як вынік, ужо з пачатку 1870-х гг. яна пачала падвяргацца карэкціроўкам кансерватыўна-ахоўчага характару. У так званым Заходнім краі (г. зн. 9-ці губернях: Віцебскай, Магілёўскай, Мінскай, Гродзенскай, Віленскай, Ковенскай, Кіеўскай, Падольскай і Валынскай) урад па палітычных матывах першапачаткова ўвогуле адмовіўся ад ўвядзення дадзенай рэформы. А затым, пры яе паэтапным распаўсюджанні ў 1872–1883 гг., бачыў у ёй сродак уніфікацыі дадзенай тэрыторыі з унутранымі губернямі імперыі.

Карэнныя пераўтварэнні 60–70-х гг. XIX ст. закранулі практычна ўсе сферы жыцця грамадства: было адменена прыгоннае права, праведзены рэформы ў вобласці суда, мясцовага самакіравання, адукацыі, друку, войска. Абавязковай умовай паспяховасці дадзеных мерапрыемстваў была іх комплекснасць і сістэмнасць, бо вынік кожнай асобна ўзятай рэформы залежаў ад пераўтварэнняў у іншых сферах. Безумоўна, рэформа судовай сістэмы мела велізарнае палітычнае і сацыяльна-эканамічнае значэнне. Яна павінна была забяспечыць давер і павагу насельніцтва да правасуддзя (а значыць дзяржавы і яе вярхоўнай улады), гарантаваць маёмасныя правы насельніцтва і суб’ектаў гаспадарання, укараніць усесаслоўнасць судовых органаў. Усё гэта было неабходнымі ўмовамі станаўлення ў Расійскай імперыі буржуазнага грамадства.

Адной з асноўных функцый судовай улады з’яўляецца абарона маёмасных правоў грамадзян. Гэта яскрава праяўляецца на этапе станаўлення і развіцця капіталістычных адносін, у аснове якіх ляжыць інстытут прыватнай уласнасці. Менавіта судовыя ўстановы забяспечваюць сродкі вырашэння эканамічных спрэчак, гарантуюць маёмасныя правы грамадзян і бяспеку дзейнасці крэдытных устаноў. Эфектыўнасць функцыянавання судовай сістэмы, такім чынам, аказвае значны ўплыў на развіццё эканомікі.

Дарэформенная судовая сістэма Расійскай імперыі была надзвычай недасканалай, што з’яўлялася перашкодай на шляху развіцця капіталістычных адносін. Кіраўніцтва краіны разумела гэта [4, с. 42] і ў выніку правядзення судовай рэформы 1864 г. дадзеная праблема ў значнай ступені была вырашана. Спрашчаўся і паскараўся працэс судаводства па грамадзянскіх іскаx. Рэалізацыя на практыцы прынцыпаў галоснасці і спаборнасці судовага працэсу, адмена канцылярскай тайны ў судах садзейнічалі росту даверу насельніцтва да правасуддзя. Рэфармаваны суд даваў значна большыя гарантыі спагнання пазык, крэдытаў, выплат па вэксалях і г. д. Адзначым, што важную ролю ў сацыяльна-эканамічным жыцці грамадства адыгрывала не толькі праца судовых устаноў па вырашэнні грамадзянскіх цяжбаў, але і крымінальных спраў, якія ўзнікалі на эканамічнай глебе (аб крадзяжах, разбоях, грабяжах, махлярствах, іншых маёмасных злачынствах, фальшываманецтве і г. д.). Судовыя ўстановы, караючы вінаватых па такіх крымінальных справах, з’яўляліся галоўным гарантам эканамічных правоў як грамадзян, так і казны.

Важным элементам судовай рэформы стала выданне 14 красавіка 1866 г. у дадатак да Судовых статутаў “Положения о нотариальной части”. Развіццё капіталізму ў эканоміцы, а таксама станаўленне адпаведных яму грамадзянска-прававых адносін,



Репозиторий БГПУ

непазбежна вяло да росту колькасці здзелак, якія патрабавалі юрыдычнага замацавання, што, у сваю чаргу, выклікала неабходнасць у больш дасканалай натарыяльнай сістэме. У дадзеным кантэксце можна пагадзіцца з вядомым савецкім гісторыкам М.М. Пакроўскім, які адзначаў, што немагчыма сабе ўявіць развітое буржуазнае грамадства, дзе няма натарыусаў, дзе для таго, каб засведчыць самы пусцяковы дакумент, трэба ці абіваць парогі судовай палаты па цэлых тыднях, ці плаціць хабар ледзь не больш дарагі, чым сам дакумент [5, с. 102]. Стварэнне ў рамках рэалізацыі судовай рэформы стройнай сістэмы натарыята спрыяла інтэнсіфікацыі развіцця эканомікі.

Адной з галоўных умоў для пераходу ад феадальнага да буржуазнага грамадства з'яўляецца разбурэнне саслоўных перагародак, а таксама рознасці ў праваздольнасці розных сацыяльных груп. Судовыя ўстановы Расійскай імперыі дарэформеннага ўзору насілі ярка выражаны саслоўны характар. Прадстаўнікі розных саслоўяў мелі розныя правы, як у плане доступу да ўдзелу ў ажыццяўленні правасуддзя, так і ў выпадках прыцягнення да суда ў якасці абвінавачанага. Гэта было адной з галоўных перашкод на шляху развіцця капіталізму ў краіне, што ў пэўнай ступені ўсведамлялі і ва ўрадавых колах імперыі. Так, напярэдадні судовай рэформы 1864 г. Аб'яднанымі дэпартаментамі законаў і грамадзянскіх спраў Дзяржаўнага савета аб пераўтварэнні судовай часткі ў Расіі адзначалася, што саслоўны характар правасуддзя стаў несумяшчальны з новымі ўмовамі жыцця краіны [6, с. 15]. Судовая рэформа 1864 г. абвяшчала прынцып бессаслоўнасці судоў. Гэта было адным з найважнейшых чыннікаў буржуазнай трансфармацыі расійскага грамадства. Новыя суды і правілы судаводства ў цэлым былі агульнымі для ўсіх саслоўяў. Пры прызначэнні на судовыя пасады і фарміраванні калегіі прысяжных засядацеляў крытэрый саслоўнай прыналежнасці ў Судовых статутах адсутнічаў. Судовая рэформа 1864 г. спрыяла развіццю бессаслоўнай грамадскай свядомасці, зараджэнню ўяўлення аб тым, што закон адзіны для ўсіх [7, с. 98].

Неад'емным элементам капіталістычнай мадэрнізацыі з'яўляецца фарміраванне грамадзянскай супольнасці, прынамсі яе элементаў. Гэта патрабуе утварэння ў сацыяльнай прасторы сістэмы свабодных ад прамога дзяржаўнага ўмяшання інстытутаў і структур, развіцця прыватнай ініцыятывы і грамадзянскай самадзейнасці, з'яўлення эканамічна свабоднага і надзеленага пэўным комплексам правоў і свабод грамадзяніна-ўласніка, пэўных змен ідэалагічных установак і менталітэту людзей. Відавочна, што складванне ўказаных умоў было б проста немагчымым у грамадстве, дзе адсутнічаў інстытут адвакатуры, правасуддзе было поўнасцю падпарадкавана адміністрацыйнай уладзе і ў цэлым не адпавядала задачам абароны асабістых, а таксама эканамічных правоў грамадзян. Судовая рэформа 1864 г. у значнай ступені вырашала гэтыя праблемы.Такім чынам, разам з іншымі буржуазнымі рэформамі 60–70-х гг. XIX ст. яна была важнейшым фактарам генезісу грамадзянскай супольнасці ў Расійскай імперыі.

Мадэрнізацыйныя працэсы, такім чынам, вялі да карэннай трансфармацыі мадэлі ўзаемаадносін грамадства і ўлады. Але для апошняй захаванне стабільнасці самадзяржаўна-імперскай канструкцыі дзяржаўнай сістэмы было фактычна сэнсам існавання. У такіх абставінах задача стварэння жыццяздольнага і эфектыўнага дзяржаўнага механізма, які б сумяшчаў феадальна-імперскія і ліберальна-капіталістычныя элементы, рабілася практычна невырашальнай [3, с. 104]. Гэта яскрава бачна на прыкладзе судовай рэформы 1864 г., якая стварыла канфлікт паміж судовай і выканаўчай уладай (у тым ліку ў асобе імператара), якая не давярала незалежнаму суду [8, с. 83]. Натуральным вынікам гэтага стала крэкціроўка судовага заканадаўства ў кірунку ўзмацнення кантролю самадзяржаўя над правасуддзем.

У Беларусі мадэрнізацыйны імпульс рэформ аказаўся значна аслаблены палітыкай імперскіх улад, накіраванай на стабілізацыю сітуацыі пасля паўстання 1863–1864 гг., а таксама ўніфікацыю краю з унутранымі губернямі [2, с. 213]. У гэты час тут быў уведзены рэжым абмежавальных законаў у дачыненні да католікаў, яўрэяў, замежных грамадзян, ішло змаганне з польскімі ўплывамі [9, с. 220]. У такіх умовах рэалізацыя судовай рэформы 1864 г. на дадзенай тэрыторыі павінна была не толькі спрыяць ўдасканаленню сістэмы правасуддзя, але і адпавядаць палітычным задачам самадзяржаўя. Як вынік, Судовыя статуты былі ўведзены тут са значным спазненнем. У 1872 г. пачалі функцыянаваць міравыя суддзі, у 1883 г. – акруговыя суды, а разам з тым – інстытуты суда прысяжных, адвакатуры, натарыята. Прычым пры абмеркаванні ва ўрадавых колах пытанняў, звязаных з пашырэннем судовай рэформы на гэтую тэрыторыю, на першым плане былі аргументы карыснасці альбо шкоднасці таго ці іншага рашэння для далейшай уніфікацыі краю з унутрырасійскімі губернямі, а значэнне пераўтварэнняў для ўдасканалення судаўладкавання і судаводства адыходзіла на другі план [10, с. 67–68].

Такім чынам, судовая рэформа 1864 г. займала ключавое месца ў капіталістычнай мадэрнізацыі, якая адбывалася ў Расійскай імперыі, у тым ліку на тэрыторыі Беларусі, у разглядаемы перыяд. На ёй замыкалася вырашэнне такіх важных праблем, як належнае функцыянаванне фінансава-эканамічнай сістэмы, эвалюцыя дзяржаўнага ладу ад феадальна-абсалютысцкага да буржуазнага, разбурэнне саслоўнай структуры грамадства, фарміраванне грамадзянскай супольнасці. У заходніх губернях стрымліваючым фактарам мадэрнізацыйных працэсаў стала палітыка самадзяржаўя, для якой тут у дадзены перыяд прыярытэтнай мэтай была барацьба з польскім уплывам і ўніфікацыя краю з унутранымі губернямі. Гэта выразна бачна на прыкладзе судовай рэформы, уведзенай у заходніх губернях са спазненнем і ў некалькі абмежаваным выглядзе.


ЛІТАРАТУРА

1. *Миронов, Б. Н.* Российская империя: от традиции к модерну : в 3 т. / Б. Н. Миронов. – СПб. : Дмитрий Буланин, 2014. – Т. 1. – 896 с.
2. *Каханоўскі, А. Г.* Сацыяльныя аспекты мадэрнізацыйных працэсаў у Беларусі (60-я гг. XIX – пачатак XX ст.) / А. Г. Каханоўскі // XXI век: актуальные проблемы исторической науки : материалы Междунар. науч. конф., посвящ. 70-летию ист. фак. БГУ, Минск, 15–16 апр. 2004 г. / Белорус. гос. ун-т ; редкол.: В. Н. Сидорцов (отв. ред.) [и др.]. – Минск : БГУ, 2004. – С. 213–215.
3. *Гавров, С. Н.* Модернизация во имя империи. Социокультурные аспекты модернизационных процессов в России / С. Н. Гавров. – М. : Едиториал УРСС, 2004. – 352 с.
4. *Коротких, М. Г.* Самодержавие и судебная реформа 1864 года в России / М. Г. Коротких. – Воронеж : Изд-во Воронеж. ун-та, 1989. – 183, [2] с.
5. *Покровский, М. Н.* Русская история с древнейших времён : в 4 т. / М. Н. Покровский. – [М?] : Гос. социально-экономич. изд-во, 1933–1934. – Т. 4. – 1934. – 448 с.
6. Журнал Соединённых департаментов законов и гражданских дел Государственного совета о преобразовании судебной части в России. – [Спб.?] : б. и., 1863. – VIII, 370 с.
7. *Попова, А. Д.* Судебная реформа 1864 года и развитие гражданского общества во второй половине XIX века / А. Д. Попова // Общественные науки и современность. – 2002. – № 3. – С. 89–100.
8. *Каспэ, С.* Империя и модернизация: общая модель и российская специфика. Империя и модернизация / С. Каспэ. – М. : РОССПЭН, 2001. – 266 с.
9. *Каханоўскі, А. Г.* Разгортванне мадэрнізацыйных працэсаў у Беларусі ў XIX–XX ст. / А.Г. Каханоўскі // Працы гістарычнага факультэта БДУ : навук. зб. / рэдкал.: У. К. Коршук (адк. рэд.) [і інш.]. – Мінск : БДУ, 2009. – Вып. 4. – С. 218–228.
10. *Гушчынскі, І. Г.* Барацьба ва ўрадавых колах Расійскай імперыі вакол правядзення судовай рэформы 1864 года на тэрыторыі Беларусі / І. Г. Гушчынскі // Вестн. Полоцкого гос. ун-та. Серия А, Гуманит. науки. – 2014. – № 1. – С. 65–68.



УДК 614.88(091) (474.4)


## ЗАРОЖДЕНИЕ СЛУЖБЫ СКОРОЙ МЕДИЦИНСКОЙ ПОМОЩИ В ГОРОДЕ МОГИЛЕВЕ


**Каплиев Алексей Александрович**
аспирант Института истории НАН Беларуси
(г. Минск, Беларусь)


В современной науке история медицины занимает важное место и являет собой уникальное направление, которое имеет выраженный элемент междисциплинарности и всеобъемлющего комплексного подхода при формировании научного нарратива. Одним из наименее исследованных аспектов истории медицины Беларуси является возникновение институтов экстрен-


Репозиторий БГПУ